# Своечасовыя думкі

## (Нататкі на палях кнігі "Адукацыя на мяжы стагоддзяў")

У прадмове да працы Н.Наторпа "Філасофія педагогікі" рускі філосаф-фенаменолаг Г.Г.Шпет разважаў аб грамадскім запыце на філасофскія веды пра адукацыю. Іх узнікненне ён звязваў з паваротнымі момантамі чалавечай гісторыі, з задачамі будучых сацыяльных трансфармацый. Іншымі словамі, змены ў практыцы актуалізуюць рэфлексіўны рух. Сёння з нейкай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што філасофскае мысленне не толькі "адлюстроўвае" змены, што адбываюцца ў свеце, і рэагуе на іх, але і ў значнай ступені вызначае, рыхтуе іх, ствараючы неабходныя ідэалагічныя перадумовы, мадэлюючы розныя варыянты развіцця падзей. У гэтым разуменні любая форма ўзнікае спачатку не ў практыцы, а як інтэлектуальнае азарэнне ў галовах людзей, што патрабуе самых разнастайных умоў, склад якіх далёка не відавочны. Гэта агульнае сцвярджэнне цалкам прыдатна і да такой сферы чалавечай дзейнасці, як адукацыя.

Сёння наша школа на раздарожжы. Новая геапалітычная сітуацыя ставіць нас перад неабходнасцю адказу на пытанне пра спецыфіку беларускай адукацыі, яе вытокі і традыцыі, адпаведнасць часу і таму ідэалу чалавека, якому давядзецца прыйсці на змену, захаваўшы пры гэтым тое, што назапашана нашым клопатам, перарваўшы заганную "традыцыю" бяспамяцтва і манкурцтва.

На маім стале кніга — "Адукацыя на мяжы стагоддзяў" (Мн.: НІА, 1995. — 158 с.). Яе аўтар — філосаф, акадэмік Мікалай Іванавіч Латыш, знаёмы мне не толькі асабіста, але і па шэрагу артыкулаў навукова-педагагічнага характару, заўсёды прыметных у рэдкіх пакуль яшчэ на Беларусі тэарэтычных выданнях. Артыкулы — гэта, зразумела, добра, аднак манаграфія, ды яшчэ па адукацыйнай праблематыцы, ды яшчэ такая, што выйшла ў нас у Рэспубліцы Беларусь, першая, адзіная... Словам, спадзяюся, што чытач зразумее маю нецярплівасць. Адкрыў. Чытаю. Прачытаў. Спрабую падсумаваць уражанні. Гэтыя нататкі — працэс і вынік іх першаснай "зборкі".

Адукацыя і Беларусь, Беларусь і адукацыя — вось, мусіць, галоўныя сэнсавыя канцэнтры, што арганізуюць увесь змест выкладання, часам складана, а часам і непасрэдна, ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, прадвызначаюць дыялогавы, рэфлексіўны характар тэксту. Адукацыйная рэальнасць нашай краіны хоць і прадстаўлена панарамна, але гэта не проста знешняе апісанне, пералік педагагічных формаў і структур, а глыбокі аналіз відавочнага, таго, што задае абрыс "магнітнаму полю" педагагічнай практыкі, таго, што на мове аўтара гучыць як "супярэчнасці і тэндэнцыі развіцця адукацыі".

Адукацыя на Беларусі ў сусветным кантэксце — тэма, распрацоўка якой заўсёды праблематычная. Тут важна дакладна вызначыць дыстанцыю, неператварыць "фігуру" ў "фон". Што і казаць,

даволі часта ў нашых зваротах да замежнага вопыту (пры ўсёй яго каштоўнасці) захопленасць навізной прыводзіць да забыцця таго, дзеля чаго, уласна кажучы, і адбываўся гэты зварот. Але часам здараецца і адваротнае, што гучыць на звычайнай мове “шарачковай” формулай “у нас усё гэта ёсць”. У першым выпадку — страта ўласнай пазіцыі і праца паводле “прынцыпу пыласоса”, у другім — правінцыяльныя самазадавальненне і закрытасць. Мне здаецца, што Мікалаю Іванавічу ўдалося правесці свой карабель паміж Сцылай і Харыбдай у нашым мысленні не толькі за кошт удалай структуры манаграфіі (глава “Традыцыі і сучасны стан адукацыі на Беларусі” з’яўляецца цэнтральнай), але і з дапамогай адмысловага даследчыцкага прыёму, пра які хачу сказаць асобна.

Справа ў тым, што ў грамадазнаўстве здаўна спаборнічаюць два падыходы, два спосабы арганізацыі навуковых ведаў. Адзін з іх можа быць вызначаны як “функцыянальны”, калі ў паняцці “згорнута” чалавечая дзейнасць з прадметам, другі — як “сутнасны”, звязаны з меркаваннем свету і паняццем аб ім у выглядзе субстанцыі, якая мае аб’ектыўны сэнс, што належыць раскрыць даследчыку. (К.Попер назваў гэтыя падыходы адпаведна “метадалагічным наміналізмам” і “метадалагічным эсэнцыялізмам”, апелюючы да сярэдневяковых схаластычных дыскусій аб прыродзе універсалій.) Функцыянальны падыход выклікае “апісальную” стратэгію навуковага пошуку, сутнасны — “тлумачальную”. Апісальнасць хіліцца да фармальна-лагічных прыёмаў і працэдур, што пануюць сёння ў прыродазнаўстве, тлумачальнасць — да разумення, інтэрпрэтацыі, уключэння чалавечага вымярэння ў працэс і вынік пазнання. Унутры саміх метадаў адбываецца своеасаблівая “аберацыя”: у першым падыходзе — вытворны ад чалавечай функцыянальнасці прыём паварочваецца “аб’ектыўным” статусам атрыманых ведаў, у другім — выведзены з “аб’ектыўнага” сэнсу з’явы спосаб навуковага адшуквання ператвараецца ў дастаткова адвольныя меркаванні і працэдуры. “Навукі пра дух”, што рэалізуюцца на Беларусі, практычна не выкарыстоўваюць “суб’ектыўную” стратэгію (стратэгію разумення), арыентуючыся ў сваёй арганізацыі на парадыгмы прыродазнаўчанавуковага пазнання, што абумовіла, як на маю думку, іх перманентны крызіс.

Аднак менавіта “метадалагічны эсэнцыялізм” дазваляе даследчыку фармаваць і ўтрымліваць тую ці іншую пазіцыю, развіваць яе, абапіраючыся на герменеўтычныя тэхнікі. Менавіта гэты зварот да герменеўтычнай практыкі, здзейснены М.І.Латышам, і дазволіў яму вытрымаць на працягу ўсёй манаграфіі “Адукацыя на мяжы стагоддзяў” беларусацэнтрысцкую пазіцыю, што, несумненна, з’яўляецца інавацыяй у сучасных гуманітарных даследаваннях.

“Сутнасны” падыход у гісторыка-культурным сэнсе з’яўляецца важным тады, калі стары сэнс чалавечай дзейнасці вычарпаны і паўстае задача пошуку і спараджэння новага. “Функцыянальны” метад выяўляе сваю вартасць на этапе праектавання, распрацоўкі знойдзенай ідэі. У выніку гэтыя прыёмы выступаюць як узаемадапаўняльныя, прычым абсалютызацыя кожнага з іх выклікае свае тупікі (у першым выпадку сцыентызм з пагрозай перарастання ў тэхнакратызм, у другім — перавытворчасць ідэй і бяздзейнасць).

Сёння час ідэй. Іх адчувальна не стае. Усе, што ні робіцца многімі педагагічнымі наватарамі, па сутнасці, аказваецца толькі новымі словамі, якія захоўваюць стары сэнс. Мікалай Іванавіч Латыш востра адчувае гэту сітуацыю. На старонках яго кнігі рупліва абмяркоўваецца сэнс паняцця “адукацыя”. Мы можам выявіць тут і “акультурванне чалавечых пачуццяў і мыслення”, і “дапамогу чалавеку ў ава-

лоданні мастацтвам жыць”, і “збіранне чалавекам сябе ў адзінае цэлае”. На апошнім хачу спыніцца асобна. Гэты сэнс можа мець, на мой погляд, вырашальнае значэнне для нашай сацыякультурнай сітуацыі вось чаму.

Крызіс чалавека, зафіксаваны многімі мысліцелямі XX ст., выклікае шматлікія, пакуль дарэмныя пошукі сучаснай сацыялогіі, узмоцненыя на Беларусі крызісам нацыянальнай ідэнтычнасці, як супольнасці, так і кожнага асобнага суб’екта. Хто мы? Адкуль? У якім накірунку нам сёння развіваць свае намаганні? Як зрабіць больш утульным дом нацыянальнай культуры? Адказы на гэтыя пытанні пакуль не атрыманы, аднак менавіта яны дазваляюць нам знайсці падставы для “збірання” сябе (самапабудовы), зрабіцца сапраўды самабытнай і раўнапраўнай нацыяй у сусветным супольніцтве. Выражаючы сёння задачы забеспячэння працэсаў самаідэнтыфікацыі, “ацэньваючы рэаліі сучаснасці, прагназуючы будучыню, мы нязменна павінны звяртацца да мінулага, каранёў вечна зялёнага дрэва жыцця, жыватворных крыніц невычэрпнай народнай мудрасці. Да нас жылі на роднай зямлі сотні пакаленняў суайчыннікаў; яны даследавалі вечныя пытанні быцця, знаходзілі рашэнні і правяралі іх дзейнасць на практыцы, вылучалі новыя ідэі, набліжаючы сённяшні дзень. І неабходна больш поўна і шырока выяўляць усе каштоўнасці, назапашаныя стагоддзямі, браць іх на ўзбраенне, выкарыстоўваць багаты вопыт папярэднікаў”. Я дазволіў сабе такую доўгую цытату з адзінай мэтай: даць магчымасць чытачу гэтых радкоў, якому будзе недаступная кніга “Адукацыя на мяжы стагоддзяў” (тыраж усяго 500 экземпляраў), адчуць яе атмасферу, яе лексіку і пластыку.

Аднак аўтар манаграфіі — не толькі знаўца прыёмаў “разумення”, але і вопытны распрацоўнік, які дэманструе валоданне фармальным метадам. Асаблівую каштоўнасць у гэтым сэнсе маюць старонкі, на якіх, абапіраючыся на вусную і пісьмовую (навукова-педагагічную) традыцыю, здзяйсняецца мадэляванне беларускай ментальнасці, рысаў характару пераважнага этнасу. Зразумела, што ў зычлівага чытача ў гэтым складаным месцы можа ўзнікнуць мноства пытанняў: так, напрыклад, незразумела, ці можна лічыць патрыятызм, працавітасць, прыстойнасць, гасціннасць і г.д. спецыфічнымі рысамі беларусаў. Чым, уласна кажучы, адрозніваецца аптымізм літоўцаў ці палякаў ад такой жа ўласцівасці характару нашага насельніцтва? Што выступае сістэмаўтваральнай асновай беларускага менталітэту? Ці такая ўжо адназначна пазітыўная з’ява ў светаўспрыманні беларусаў “лаяльнасць да іншых народаў і іх поглядаў”? Ці не з’яўляецца славутая “талерантнасць” неаднаразова апісанай у гістарычнай псіхалогіі “канформнасцю” традыцыйных супольнасцяў, вытворнай ад нізкага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці?

Вельмі добра, што манаграфія М.І.Латыша дае магчымасць не “змазваць” і замоўчваць гэтыя і іншыя праблемы, а ў канкрэтнай і зразумелай форме іх вылучаць. У гэтым якраз і заключаецца важнейшая функцыя філасофска-метадалагічнай працы.

Паколькі размова зайшла пра дыскусійныя фрагменты, то паспрабую акрэсліць яшчэ адну праблемную галіну, што закранута ў кнізе прафесара М.І.Латыша. Для сучаснага навукоўца, а тым больш метадолага ў галіне педагагічных даследаванняў, адукацыя — з’ява полісістэмная, са складаным узаемадзеяннем працэсаў, механізмаў, элементаў і функцый. Складанадынамічныя шматфункцыянальныя аб’екты патрабуюць такіх жа складаных сродкаў для іх аналізу. Пры іх распрацоўцы і выкарыстанні заўсёды ёсць пагроза спрашчэння, што выяўляецца ў наданні таму ці іншаму паняццю (комплексу паняццяў) статусу канчатковай цэласнасці. Між тым у не-

класічнай рацыянальнасці асэнсаванне залежнасці структуры рэальнасці ад выкарыстаных паняццяў-сродкаў даўно ўжо зрабілася агульным месцам. Адсюль і імператыў абавязковасці метадалагічных пошукаў. Разумеючы гэту акалічнасць, М.І.Латыш уводзіць для аналізу адукацыйных працэсаў адзіную падставу — практыку навучання. У ёй вылучана пяць базавых тэорый: традыцыйна-кансерватыўная, рацыяналістычная, фенаменалагічная, кагнітывісцкая, сацыялрэканструктывісцкая. Аўтар падкрэслівае ўмоўнасць такога размежавання і яго мадэльнасць. Прымаючы і разумеючы адноснасць схем такога роду, я адначасова асэнсоўваю, што рэалізацыя даследчыцкіх стратэгій метадам тэарэтычнага мадэлявання (у адрозненне ад эмпірычнага абагульнення) вядзе да ўзрастання ролі і значэння фармальна-лагічных аперацый, запатрабоўваючы ўнутрана несупярэчлівых знакавых мадэляў.

Аднак больш уважлівы разгляд прапанаваных мадэляў навучання выяўляе рознафокуснасць іх утрымання. Так, рацыяналістычная тэорыя навучання разглядаецца з пункту погляду "тэхналогій узнагарод і пакаранняў", г.зн. з боку выкарыстаных педагагічных сродкаў і прыёмаў, у той час як у мадэлі кагнітывісцкага навучання акцэнтуецца мэтавая функцыя — фундаментальныя метадалагічныя веды, што дапамагаюць моладзі арыентавацца ў свеце, здзяйсняць самаадукацыю і самавыхаванне, адаптавацца да соцыуму. Пры такім падыходзе не выключана, што адзіная плоскасць аналізу — выявіць не рознасць, а тоеснасць аб'ектаў. У рэшце рэшт, гэта, як кажуць, і неабходна абмяркоўваць.

Хаця гэтыя і некаторыя іншыя мадэлі і высвятленні носяць папярэдні, намінатыўны характар, другасны ў агульнай логіцы, стратэгічнай па сваім прызначэнні манаграфіі, я рызыкнуў выказаць некаторыя праблематызаваныя меркаванні і ўдакладненні толькі дзеля таго, каб "эфект арэолу", выкліканы безумоўным аўтарытэтам доктара М.І.Латыша ў педагагічным свеце, не паўплываў негатыўна на крытычнасць мыслення яго паслядоўнікаў, у чым, зразумела, зацікаўлены і ён сам.

У тэксце працы змяшчаецца дастаткова многа іранічных месцаў, у якіх якраз і сцвярджаецца неабходнасць у крытычным характары філасофскага настрою думак. М.І.Латыш з гумарам адзначае, што часта сучасную школу хваляць і дакараюць за адно і тое ж адначасова. "Адны спецыялісты востра крытыкуюць строгую школьную дысцыпліну, нібы небяспечную для развіцця дзіцяці, іншыя ўказваюць на неспадзяваную небяспеку пры яе паслабленні... Агульнае, што адзначаецца, — гэта недахоп фінансавых сродкаў". Урэшце, гумар у навуковых працах — дастаткова цікавы, самастойны сюжэт.

Зараз жа час заканчваць "нястройны рад" першасных уражанняў. Пройдзе час, і прачытаная мной сёння кніга ажыццявіць нябачную ўнутраную працу, спародзіць новыя нечаканыя бачанні, якія толькі пры асабліва пільным аналізе можна звязаць з іх першакрыніцай. Аднак на аналіз звычайна не хапае часу, а дасягненні мы схільныя прыпісваць сабе. Гэта значыць, што вядомы паэт не зусім мае рацыю: не заўсёды "вялікае бачыцца на адлегласці", паколькі часта іншавыяўляецца.

Я думаю пра наш няпросты час. Цяжкасці сучаснага жыцця не лаяў толькі лянівы. Між тым усё так неадназначна, і ўзлёты ў культуры далёка не заўсёды тоесныя эканамічным дасягненням. Хаця і ў эканоміцы, і ў навуцы сёння, як мне здаецца, неабходна адно і тое ж — трэба пачынаць будаваць. Мікалай Іванавіч Латыш пачаў акрэсліваць праект сучаснай беларускай педагогікі. Дай яму Божа поспеху і надзейных памочнікаў!

***А.А.Палоннікаў,***
*кандыдат псіхалагічных навук*